Вольга Казакевіч, Андрэй Казакевіч

# Да праблемы генезісу беларускай ідэнтычнасці

*Abstract:*

Аўтар спрабуе сістэматызаваць звесткі пра этнічную свядомасць Беларусі ў Сярэднія вякі. У прыватнасці, аналізуюцца асаблівасці этнаканфесійнай свядомасці даўняй Беларусі, яе спалучэнне з найменнямі «Русь», «Літва», «Белая Русь» і г.д. Асобна разгледжана трансфармацыя свядомасці насельніцтва Беларусі ў перыяд Рэнесансу, што было звязана з паступовым пераходам ад рэлігійнай да этнічнай свядомасці.

«*Гісторыя*» беларускай ідэі, у розным значэнні гэтага слова, мае працягласць, якая дазваляе пакласці яе паміж Асветніцтвам і Сучаснасцю (постмадэрнам, калі выкарыстоўваць звыклы жаргон). Разважанні на тэму пачатку *ідэі,* як і яе *завяршэння* (*адраджэння*), поруч з гістарычнымі даследаваннямі забяспечылі спрыяльную глебу для мноства палітычных і культурных канцэптаў ды фантазій і нават спарадзілі разнастайную рамантычную літаратуру.

Уяўленні пра генезу беларускай ідэі былі, відавочна, важным фактарам для палітычнага аднаўлення беларускага руху ў 1980—1990-х гадах і ў нейкай ступені фармавалі стаўленне навукоўцаў суседніх дзяржаваў, якія былі вымушаны з пачатку 90-х апазнаваць Беларусь як актуальную рэальнасць. Тым не менш, кадыфікацыі генеалогіі беларускае ідэі не адбылося, і пытанне застаецца адкрытым не толькі з пазіцыі крытыкі, але і рэканструкцыі. У гэтым тэксце мы паспрабуем выкласці сінтэтычную траекторыю развіцця беларускае ідэі (якая павінна быць адлюстравана ў графічнай схеме), выкарыстоўваючы тэкст І. Бабкова [1], пры гэтым жорстка не звязваючы сябе з яго канцэптамі. Сама траекторыя, магчыма, не будзе нечаканаю (асабліва для тых, хто збольшага знаёмы з праблематыкаю беларускае ідэнтычнасці), але карыснай нам для параўнання з іншымі «траекторыямі», апісанне якіх змешчана ў гэтым нумары.

Часавыя і прасторавыя рамкі сведчаць пра тое, што, калі мы кажам пра «беларускую ідэю», гаворка вядзецца пра складаны гістарычны феномен, нават калі не браць пад увагу перыферыйныя *ідэі,* якія выходзяць за рамкі ўласна беларускага кантэксту, напрыклад стварэнне літоўскага нацыянальнага руху. Звыклая лакалізацыя «беларускага» сёння таксама часта ставіцца пад пытанне. Асабліва пры вырашэнні праблемы сацыяльнае культурнае лакалізацыі такіх палітычных феноменаў, як польскамоўны краёвы рух і заходнерусізм, якія непрадуктыўна цалкам выключаць з корпусу «беларускае ідэі» ў шырокім сэнсе, але яны ў значнай ступені выпадаюць з яго кантэксту.

Перавага тэксту І. Бабкова, пры ўсіх супярэчнасцях і недакладнасцях, менавіта ў дастатковай прасторавай і часавай разняволенасці і пашыранай перспектыве, якую мы і возьмем за аснову[1]. Пашыраная перспектыва ўключае ў сябе не толькі ўласна «беларускі рух», але і іншыя працэсы нацыягенезу (польскага, расійскага, літоўскага), якія адбываліся адначасова і ў межах аднаго грамадства і якія таксама можна інтэрпрэтаваць як, прынамсі часткова, беларус-

[1] Паводле жанру тэкст можна аднесці хутчэй да рэфлексіўна-публіцыстычнага (стыль падобны на цыкл лекцыяў і перанасычаны метафарамі). Хада мыслення не заўсёды дакладная, апісанне адных феноменаў можа рабіцца дастаткова падрабязна, у той час як іншым (роўным па значэнні) адводзіцца некалькі абзацаў. Акрамя гэтага, заўважная практычна поўная адсутнасць спасылак на беларускіх аўтараў (бібліяграфія ўтрымлівае толькі замежныя крыніцы). Пэўныя пытанні выклікае тэрміналогія (у прыватнасці, тэрмін «праект» у дачыненні практычна да ўсіх культурных практык), а таксама храналогіі (указанне канкрэтных датаў сканчэння «праектаў» і эпохаў). Але пакінем такія заўвагі па-за абмеркаваннем як неістотныя для мэтаў гэтага артыкула.

кія[2]. Беларускасць тут пераважна факт тутэйшасці, а не нацыянальнае і палітычнае прыналежнасці. Акрамя гэтага, тэкст утрымлівае канцэпцыю беларускае савецкае ідэнтычнасці, а таксама ўлічвае ў нацыягенезе «раскол» Літвы, якая доўгі час утварала палітычную і, да пэўнай ступені, сацыяльную цэласнасць.

## II. Фрагментарны агляд тлумачальных схемаў: «тэорыі слабасці» і «гераічнага супраціву»

Уласна разгортванне «беларускае ідэі» прадугледжвае кароткі агляд яе тлумачальных схемаў, галоўным чынам знешніх назіральнікаў і даследчыкаў. Веда звычайна палітычна ангажаваная і ўпісаная ў культурны кантэкст, мае «сацыякультурную лакалізацыю [1, с. 136]. Гэта ў поўнай меры датычыць як уласна «ідэі» ідэнтычнасці, так і яе інтэрпрэтацыі, а таксама розных варыянтаў разумення беларускае сітуацыі вонкавымі назіральнікамі.

«Ідэнтычнасць не столькі рэспектабельны аб’ект даследаванняў, колькі поле вайны, у якой веда і ўлада бяруць самы актыўны ўдзел», «праект зборкі комплексу палітычных, сацыяльных і культурных стратэгіяў».

Беларуская ідэнтычнасць, у прынцыпе, не была аб’ектам даследавання ў заходняй гуманітарнай навуцы (асабліва да 1991 года), а з’яўленне беларускае незалежнае краіны выклікала хутчэй шок і разгубленасць. Адбылося палітычнае паўстанне прасторы, «пра якую ніхто нічога не ведаў», таму яе апісанне было моцна звязанае са стэрэатыпамі. Беларусы ўзгадваліся толькі ў пераліку народаў (у кантэксце паняволеных народаў — спадкаемцаў Рэчы Паспалітай), але існаванне аформленае беларускае савецкае культуры звычайна ігнаравалася. Як на Захадзе, так і на Усходзе Беларусь разглядаецца пераважна як «хімернае, буфернае, пераходнае ўтварэнне», якое не мае аўтаномнае суб’ектыўнасці [1, с. 137—138]. З часам, аднак, Беларусь атрымала статус асобнага выпадку — феномен было цяжка патлумачыць, але існаванне рэальнае дзяржавы не выклікала сумневу і патрабавала тлумачэння.

Схемы тлумачэння беларускае сітуацыі І. Бабкоў пазначае як «тэорыі», маючы на ўвазе не толькі акадэмічныя канструкцыі, але і інтэлектуальныя і часткова побытавыя спробы канцэптуалізацыі беларускае сітуацыі. Такіх тэорыяў (дакладней, групаў тэорыяў) аўтар вылучае дзве: тэорыі «слабасці» і «гераічнага супраціву» [1, с. 139—140], якія па сутнасці ўтвараюць адзіны сэнсавы комплекс, толькі з рознымі акцэнтамі[3].

Анармальнасць сітуацыі (параза праекту гамагенізацыі — польскай, беларускай, расійскай[4]) тлумачыцца рознымі фактарамі: культурная і моўная гетэрагеннасць, негістарычны характар нацыі і г. д. Беларуская ідэнтычнасць — «маўклівая рэальнасць», якая не здолела прабіцца на ўзровень рэпрэзентацыі. Прычыны розныя: метафізічная слабасць, містычнае нежаданне, належнасць да заганнага цывілізацыйнага кола (праваслаўнага). Асобна адзначаецца перыферыйнасць з пункту гледжання еўрапейскае мадэрнасці, польскага ды расійскага нацыягенезу.

У акадэмічным асяроддзі «тэорыі слабасці» знайшлі адлюстраванне ў разнастайных мадэлях затрыманае, няскончанае мадэрнасці (як лінейнае траекторыі), тэорыі «вясковай нацыі» (толькі вяскоўцы былі «сапраўднымі» беларусамі).

У прыватнасці, такім чынам інтэрпрэтуе сітуацыю Р. Радзік, які звязвае затрыманы нацыягенез беларусаў з вясковым і праваслаўным характарам улады [9, 10]. Вывады Радзіка можна аднесці як да «тэорыі слабасці», так і «гераічнага супраціву», што адлюстроўвае наяўнасць нацыягенезу беларусаў насуперак нацыятворчым фактарам і адсутнасці дзяржавы. Гэта яшчэ адно сведчанне ўмоўнасці пазначанага падзелу і яе недастатковае інтэрпрэтацыйнае здольнасці. Акрамя Радзіка, Бабкоў узгадвае гісторыкаў Д. Бавуа і П. Вендрыча. Першы нібыта ўпершыню ўзяў пад увагу каланіяльныя стратэгіі ў рэгіёне і паставіў пытанне пра тое, чаму слабое грамадства існуе да гэтага часу, а моцныя ідэнтычнасці так і не перамаглі. Другі аднёс беларускі і славацкі нацыягенезы да найбольш складаных і дзіўных варыянтаў захавання ўласнае ідэнтыч-

[2] І. Бабкоў кажа пра дамінаванне стратэгіі «сімбалічнай гамагенізацыі», якая абазначае трактоўку іншага як неістотнага і небеларускага [1, с. 140].
[3] Часам розніца ў пазіцыях нагадвае спрэчку аптыміста і песіміста.
[4] У радыкальных версіях размова ідзе пра паразу мадэрна, што з’яўляецца, аднак, не больш чым метафараю.
[5] Пра падабенства беларускага і славацкага нацыягенезу глядзі ў прыватнасці [5].

насці. «Паспяховы супраціў і выжыванне нягледзячы на еўрапейскую мадэрнасць»[5]. Натуральна, спіс даследчыкаў Беларусі значна больш шырокі, у прыватнасці варта ўзгадаць А. Зам [6], Р. Лінднэр [8] і некаторых іншых. Але збольшага кола замежных навукоўцаў, якія даследуюць беларускую сітуацыю, дастаткова абмежаванае.

«Гераічны супраціў» можна інтэрпрэтаваць як канцэпцыі змагання беларусаў з каланіяльнымі стратэгіямі. Гераічны супраціў паўстаў у беларускай гістарыяграфіі на пачатку XX стагоддзя і падкрэсліваў пераемнасць беларускай нацыі са старымі дзяржавамі на яе тэрыторыі. Цэнтральнае значэнне надаецца актуалізацыі спадчыны Полацкага княства (якое выступае храналагічна першай формаю беларускае дзяржаўнасці) і асабліва Вялікага Княства Літоўскага, існаванне якога ахоплівае шэсць стагоддзяў беларускае гісторыі.

## III. Паўстанне праектаў каланізацыі

Агляд тлумачальных схемаў не дае цэласнае карціны развіцця нацыянальнае ідэнтычнасці, але толькі ўводзіць у яе кантэкст. Сацыяльная і культурная прастора Беларусі дэманстравала значную гетэрагеннасць і ўтрымлівала падставы для адначасовага развіцця некалькіх нацыягенезаў: польская дзяржаўная традыцыя, беларуская мова славянскага насельніцтва, расійская адміністрацыя і праваслаўная царква. Усё гэта спалучалася з моцнай тутэйшасцю як базавай тоеснасцю для пераважнае часткі мясцовага насельніцтва.

Мадэрную фазу беларускае ідэнтычнасці І. Бабкоў выводзіць з канца XVIII стагоддзя (наколькі можна зразумець, размова ідзе тут пра ідэнтычнасць шляхты, хоць і ў гэтым выпадку гэта самая ранняя з магчымых часавых рамак) і перадае «меркаванне некаторых аўтараў» (без спасылкі), што яна да гэтага часу з яе не выйшла. Затрымка з'яўляецца спецыфічнай праблемаю для даследчыкаў і апісваецца звычайна як недааформленасць, апазнаецца як вынік «перыферыйнага», у адносінах да еўрапейскае «універсальнасці», статусу.

Уласна разгортванне *генеалогіі* беларускае ідэі І. Бабкоў пачынае з апошніх гадоў існавання Рэчы Паспалітай, калі паўстаюць спачатку польскі, а пазней (пасля падзелаў) расійскі каланізацыйныя праекты ў дачыненні да Беларусі. Чаму генеалогія пачынаецца менавіта з паўстання каланіяльных стратэгіяў і чаму яе пачатак быў звязаны менавіта з каланіяльнымі інтэнцыямі, на жаль, не пазначаецца. Увогуле храналогія ў тэксце здаецца дастаткова адвольнай і не зусім пераканаўчай.

*Польскі праект каланізацыі*. Праект свядомай паланізацыі Беларусі паўстаў пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай і, як вядома, быў моцна звязаны з жаданнем гамагенізаваць прастору агульнае дзяржавы, а таксама з рэалізацыяй асветніцкага праекту «адзінае нацыі». Нягледзячы на знікненне Рэчы Паспалітай, каланізацыйны праект працягваў сваё існаванне ў межах Расійскай імперыі да 1830-х гадоў. Асобна трэба падкрэсліць «каланізацыйную сутнасць» асветніцкага праекту ў Рэчы Паспалітай [2, с. 19—24], які быў накіраваны на гамагенізацыю і стандартызацыю масавае свядомасці праз распаўсюджванне агульных уяўленняў пра гісторыю, культуру і, урэшце, агульнае ідэнтычнасці.

Польскі каланізацыйны праект сутыкнуўся не толькі з геапалітычнымі зменамі, але і з нечаканай разнастайнасцю прасторы Вялікага Княства Літоўскага і масівам традыцыйнае культуры, што зрабіла немагчымым хуткую інтэграцыю і паступова сфармавала своеасаблівы вобраз усходніх «крэсаў» як спецыфічнае і асобнае тэрыторыі.

Такім чынам, у выніку польскага каланізацыйнага праекту адбываецца частковая асіміляцыя мясцовае шляхты, але збольшага ён спрычыніўся да стварэння ў польскай ментальнасці спецыфічнага палітычнага і культурнага канцэпту «крэсаў» як нечага не зусім свайго, але патэнцыйна польскага.

*Расійскі праект каланізацыі*. Расійскі праект каланізацыі некалькі спазняўся і быў маргінальным, асабліва да 30-х гадоў XIX стагоддзя[6]. Пэўныя інтэнцыі мелі месца на пачатку XIX стагоддзя, але яны не сталі палітычнаю практыкай. Што да стварэння ўласна расійскай адміністрацыі («пятае калоны», як яе часам называюць), то гэта ў значна большай ступені было выклікана неабходнасцю ўтаймаваць мясцовую супольнасць, чым паўстаннем праекту

[6] Тут мы не згодныя з пазіцыяй І. Бабкова, які лічыць, што польскі і расійскі праекты каланізацыі паўсталі сінхронна.

каланізацыі. Структура і характар палітыкі мелі логіку, хутчэй, рэагавання на нелаяльнасць, а не спланаванае стратэгіі і тым больш праекту. Да 30-х гадоў XIX стагоддзя польскі статус у рэгіёне не мяняўся, а пэўныя меркаванні на гэты конт «рускае» (былое уніяцкае) генерацыі звычайна ігнараваліся метраполіяй і заставаліся маргінальнымі. Беларусь як прастора каланізацыі (у тым ліку і на акадэмічным узроўні) была апазнаная крыху пазней, у другой палове XIX стагоддзя. Расійскі і польскі праекты не былі сіметрычнымі, мелі розныя стратэгіі і не праяўляліся сінхронна.

## IV. Траекторыя развіцця «беларускае ідэі»

Калі звярнуцца да схемы І. Бабкова, то ўласна апісанне нацыятворчага праекту (і працэсу паўстання беларускае ідэнтычнасці) ён робіць праз разгортванне трох беларускіх «праектаў», якія проста нумаруе «Беларусь 1», «Беларусь 2», «Беларусь 3». Такія назвы, на нашу думку, не зусім адэкватныя, таму надалей будуць выкарыстоўвацца больш традыцыйныя схемы. Трэба адзначыць, што, напэўна, не зусім карэктна ўжываць для ўсіх феноменаў культурнага і ідэалагічнага развіцця Беларусі XIX стагоддзя паняцце «*праект*» як візію, накіраваную ў будучыню. Далёка не ўсе праявы беларускага мыслення мелі такія ўласцівасці.

*Краёвая польскамоўная шляхта*. Паўстанне «праекту» краёвай шляхты было цесна звязанае з падзеламі Рэчы Паспалітай і апазнаваннем новых тэрыторыяў у складзе Расійскае імперыі як «Белоруссии». Ва ўмовах першай паловы XIX стагоддзя афармляецца новая мадэль ідэнтычнасці, паўставанне якой цесна звязанае з дзейнасцю польска-беларускіх літаратараў і даследчыкаў. Новая версія ідэнтычнасці развіваецца да 50-х гадоў, калі пачынае адчувацца культурны ціск з боку Расіі: беларуска-польская сітуацыя змяняецца беларуска-расійскай. Можна вылучыць тры этапы развіцця «праекту». Першапачаткова Беларусь апазнаецца як «цёмная», «абскуранская» (у рамках кансерватыўнай рэакцыі на Асветніцтва). Кансерватыўны перыяд змяняецца кансерватыўна-рамантычным (этнаграфічным), які, у сваю чаргу, эвалюцыянуе ў народніцтва ды краёвую ідэю [1, с. 146]. Краёвая ідэя як спецыфічны палітычны феномен становіцца важным элементам палітычнага і інтэлектуальнага ландшафту Беларусі канца XIX — пач. XX стагоддзя[7].

Найбольшае значэнне для перыяду маюць тэксты Я. Баршчэўскага («Шляхціц Завальня...») і Р. Падбярэцкага («Лісты пра Беларусь»), якія можна разглядаць як асноўную крыніцу для разумення сутнасці «новае мадэлі беларускасці» і маніфестацыі яго суб'ектыўнасці. Візія Я. Баршчэўскага абыходзіцца без выключэння іншых і мае ў падвалінах «тутэйшасць». Мадэль ідэнтычнасці, прапанаваная (маніфеставаная) Баршчэўскім, відавочна, немадэрная, яна мае галоўным чынам «прасторавае» вымярэнне (прывязаная да *тэрыторыі*) і з'яўляецца «тутэйшай» (аўтахтоннай), заснаванай на адухаўленні прыроды і натуралізацыі культуры. Пры гэтым культура — гэта перш за ўсё культура традыцыйная, народная, угрунтаваная ў глебу і прастору. У такой ідэнтычнасці фармальна няма цэнтру, сталіцы, улады, сацыяльнае і культурнае стратыфікацыі і адначасова няма месца расійскай адміністрацыі, якая ў адпаведнасці з антыкаланіяльнай стратэгіяй «праекту» выключаецца за межы. Фактычна няма народа як арганічнай натуральнай і этнічнай супольнасці, знойдзенага ў праекце Літвы, і няма «рускасці» ды праваслаўнасці, якія былі знойдзеныя і рэанімаваныя ў заходнерусізме.

*Паўстанне новай Літвы*. Паўстанне Беларусі было шчыльна звязанае з рэдэфініцыяй палітычнага паняцця «Літва» (якое склалася ў сярэднія вякі), а фактычна з яго расколам. З адкрыццём этнічнага народа і перш за ўсё з паўстаннем «народнае культуры» адзіная для былога Вялікага Княства шляхецкая культура губляе манаполію і перастае быць натуральнаю асноваю палітычнае супольнасці. Адбываецца апазнаванне народа як адзінага легітымнага суб'екта гісторыі і атаясамленне яго з «вясковым людам» і паралельна фармаванне рэвалюцыйнае антыімперскае ідэалогіі вызвалення. Этнічны рух балцкага насельніцтва гістарычнае Літвы разломвае ідэнтычнасць апошняй, інтэгруе ў сябе частку польскамоўнае шляхты і паступова ставіць пад пытанне любы «літоўскі» праект, які не абапіраецца на этнічную літоўскую (балцкую) культуру, хоць розныя версіі літоўскае палітычнае («шляхецкае») нацыі ўплываюць на палітыку ў рэгіёне да Першай сусветнай вайны.

[7] Сінтэтычная праца на гэтую тэму [11].

*Заходнерусізм* — спецыфічны беларускі феномен, які доўгі час вызначаў (і ў пэўнай ступені да гэтага часу вызначае) культурны ландшафт Беларусі. Заснаванне заходнерусізму было моцна звязанае з гістарычнымі даследаваннямі (асабліва М. Каяловіча), прычым галоўнай іх стратэгіяй было сцверджанне «рускага» характару Вялікага Княства Літоўскага і, шырэй, пошук славянскага і рускага ў «літоўскай» гісторыі ўвогуле. Дарэчы, гэта стратэгія пошуку рускасці была ці не супрацьлеглаю больш позняй савецкай русацэнтрычнасці з яе націскам на палітыка-культурнай другараднасці беларусаў і ўкраінцаў у Вялікім Княстве Літоўскім [7, с. 50—54]. Традыцыйны заходнерусізм падзяляюць на радыкальную («кансерватыўна-шавіністычную») і памяркоўную («ліберальна-памяркоўную») плыні. Першая разглядала мясцовыя адрозненні як забруджванне і «хваробу» і выступала за поўную асіміляцыю краю (К. Гаворскі), другая была схільная да прызнання рэгіянальных асаблівасцяў, але ў вельмі абмежаванай, культурна ўтаймаванай і палітычна нейтральнай форме (М. Каяловіч)[8].

*Беларусь этнічная*. Сімвалічным пачаткам паўстання руху «беларускага народа» можна лічыць выданне Ф. Багушэвічам вядомае «Дудкі беларускае» («праект для народу, ад імя народу і моваю народу» [1, с. 150]), які разгортваецца з перспектывы прыгнечанага і інтэрпрэтуе свет вачыма «мужыка». Да канца XIX стагоддзя культурная прастора была полікультурнаю і полілінгвістычнаю, гэта культура не была мононацыянальнай, але была беларускай. Аднак у «слабым беларускім грамадстве» (слабым у значэнні з аслабленаю ідэнтычнасцю і групавой ідэнтыфікацыяй) пры канцы XIX стагоддзя была ўсвядомлена наяўнасць маўклівае большасці — народа. І гэты народ быў вызначаны як беларускі. Істотна змяняецца змест беларускасці, на месца лакальных супольнасцяў прыходзіць разуменне адзінае нацыі. На народніцкім грунце паўстае праект вызвалення — стварэння сучаснае нацыі, які паступова афармляецца ў культурна-палітычны рух «Адраджэння».

*Беларускае «Адраджэнне»* фармуецца на пачатку XX стагоддзя (яго пачаткам можна лічыць стварэнне ў 1902 годзе Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады, пазней перайменаванай у Беларускую Сацыялістычную Грамаду) і мае ў аснове народніцкую праграму абуджэння народа і яго вызваленне. Сама Грамада вызначала сябе як арганізацыю «беларускага працавітага народу» [3]. Паўстае не толькі палітычная — у выглядзе партыі, — але і культурная інфраструктура руху, пашыраецца друк, выходзяць першыя беларускія газеты («Наша доля», «Наша ніва»). З гэтага перыяду пачынаецца ўласна беларускі нацыянальны праект, крышталізуецца корпус ідэяў, якія захоўваюць сваю пераемнасць на працягу ўсяго XX стагоддзя.

Праект быў накіраваны не столькі на нацыянальнае (гэтаму не аддавалася першапачатковае ўвагі), колькі сацыяльнае і эканамічнае вызваленне. Вызваленне ад патройнага прыгнёту: эканамічнага, які рэпрэзентавалі паны-абшарнікі; палітычнага (расійскі ўрад «не дазваляў свабодна выпрацоўваць формы рэпрэзентацыі і адстойваць свае правы»); нацыянальны (у XX стагоддзі і шляхта, і чынавенства адмаўляюцца разумець «мужыцкую гаворку» і супрацьпастаўляюць сябе вясковай культуры). Новае апазнаванне народнае рэальнасці было зусім не такім, як зафіксаваны ў шляхецкай літаратуры і этнаграфіі вобраз «добрага мужыка». Рэчаіснасць была ці не супрацьлеглая.

Пры гэтым традыцыйная культура і фальклор практычна не прысутнічае ў мысленні абуджальнікаў, або прысутнічае толькі на другім плане. Новы рух думае не пра нацыянальную ідэнтычнасць, але пра тое, каб «даць голас прыгнечанаму». У беларускім праекце, такім чынам, адбываецца рэферэнцыя голасу прыгнечаных і голасу абуджальнікаў, якія скіраваны да краёвай інтэлігенцыі.

І. Бабкоў вызначае пачынальнікаў беларускага руху як беларуска-польска-расійскамоўных інтэлектуалаў, якія імкнуцца стварыць альтэрнатыўную эліту краю. Трэба заўважыць, што далёка не ўсе з іх былі «інтэлектуаламі» і не ўсе думалі пра стварэнне «эліты», іх паводзіны, відавочна, не былі настолькі рацыянальнымі[9]. Малаверагодна, каб рацыянальны выбар быў звязаны з выбарам «беларускае арыентацыі», асабліва калі ўлічыць напружаную канкурэнцыю ў Беларусі паміж нацыянальнымі культурамі і праектамі.

Напачатку ідэалам адраджэння з'яўлялася краёвая ідэя, якая да пэўнай ступені супрацьпа-

[8] Адзінай сістэмнай працай па заходнерусізме да гэтага часу застаецца кніга Цвікевіча, выдадзеная ў 1929 годзе [13]. Праца, акрамя іншага, утрымлівае і аналіз «сацыяльнага фону» заходнерускае ідэі.
[9] Аналіз сацыяльных рэсурсаў нацыянальнае мабілізацыі беларусаў XIX — пач. XX стагоддзя гл. у [12].

стаўлялася нацыяналістычнаму праекту. Толькі падчас Першай сусветнае вайны паўстае афармлены «праект нацыі» і імкненне ўпісаць яе ў агульнаеўрапейскі кантэкст. Адбываецца рэканструкцыя беларускае гісторыі як непарыўнага і пераемнага працэсу. Адначасова беларуская тоеснасць пачынае дыстанцыявацца ад «рускасці», з яе праявамі мангольскага, візантыйскага і ўсходняга. Парадаксальным чынам беларусы інтэрпрэтуюцца адначасова і як старажытны народ (з уласнай палітычнай традыцыяй), і як маладая нацыя, «якая ідзе агульнаеўрапейскімі дарогамі прагрэсу».

Адбываецца тое, што І. Бабкоў пазначае як «пералом да нацыянальнага», з істотнымі зменамі стратэгіяў і стылю паводзінаў. Гэта розныя рэчы — «даць голас прыгнечанаму і стварыць нацыю»: першае патрабуе рэвалюцыйнага парыву, другое — стварэння і навязвання нарматыўнасці, а таксама іншае ідэалогіі — нацыяналізму.

У адрозненне ад сваіх непасрэдных папярэднікаў нацыяналізм апелюе да ўсяго народа, у тым ліку і прыгнятальнікаў. Калі вызваленне было звязанае з абуджэннем вёскі, то нацыянальны рух патрабаваў высокае культуры, стварэння адпаведнае інфраструктуры і інстытуцыяў з перспектываю гамагенізацыі беларускага горада. Апазіцыя «народ — прыгнятальнікі» замяняецца супрацьпастаўленнем «беларусы» і «*тожа беларусы*» (адгалосак яго ў 1980-х — пачатку 1990-х гадоў выявіўся ў апазіцыі «свядомыя — несвядомыя»), якія павінны стаць аб'ектам каланізацыі.

## Феномен савецкай Беларусі

Малаверагодна, што паўстанне Літвы, заходнерускі праект, нацыянальнае адраджэнне і краёвая ідэя былі аднолькава важнымі і вызначальнымі фактарамі «фармавання» беларускае ідэнтычнасці. Да гэтага часу мы не рабілі такіх высноваў, даючы выключна фатаграфічную фіксацыю гістарычных феноменаў развіцця «беларускае ідэі». Найбольш прыдатным было б сцвярджэнне, што ў выніку палітычнай (каланіяльнай) барацьбы паміж польскім рухам і расійскай адміністрацыяй, а пазней пад уздзеяннем савецкага тыпу мадэрнізацыі адбываецца трансфармацыя нацыянальнага руху (у тым ліку праз яго частковае вынішчэнне) і, што асабліва важна, сацыяльных і культурных умоваў яго развіцця. Аднак у пэўных «*прасторах спадчыннасці*» (гэта перш за ўсё беларуская літаратура, фальклор) захавалася пераемнасць сацыяльных і культурных практык, ідэяў, «вясковае» мовы і інстытуцыйнае практыкі.

Менавіта такім быў феномен савецкае Беларусі, пераважна «небеларускі» (у нацыянальным разуменні), але з інкарпараванымі часткамі «прастораў спадчыннасці» адраджэнскага руху пачатку XX стагоддзя. Можна зыходзіць з прэзумпцыі пераемнасці і падкрэсліць наступнае: беларускасць, для якой была характэрная вымушаная перавага абарончых стратэгіяў, перманентна перажывала пранікненне знешніх элементаў, што было выклікана ўплывам ідэяў, але перш за ўсё фактарамі сацыяльна-палітычнай трансфармацыі.

Пры гэтым у прастору функцыянавання беларускасці пранікалі элементы больш арганізаваныя і палітычна легітымныя, звязаныя з падтрымкаю ўлады (каланізацыя). Але такое пранікненне не спрычынілася да поўнага кантролю і падначалення беларускасці (магчыма, проста не хапіла часу) і было вымушана дапусціць распаўсюджванне беларускасці ў раней нязвыклыя прасторы (у тым ліку і ўладу), асабліва пасля легітымацыі на палітычным узроўні праз стварэнне БССР. Доўгі час уплывы насілі неаднародны несістэмны характар і не былі звязаныя са стварэннем сістэмы кантролю. Толькі пазней (пры канцы 20-х гадоў) адбываецца рацыянальнае і арганізаванае перапісванне гісторыі, «рэформа» культурных канонаў і ўрэшце рэформа правапісу (1933), якая стала важнай сімвалічнай падзеяй. Ад гэтага часу можна казаць пра паступовае афармленне дзвюх асноўных культурных дамінантаў. Першую дастаткова ўмоўна можна назваць нацыянал-дэмакратызмам, які імкнуўся захаваць нацыянальнае ў межах савецкай сістэмы, другая — «саветызм», які паступова паўставаў як праект выціскання нацыянальнага на карысць *агульнасаюзнага*.

Значная колькасць беларускіх даследчыкаў успрымаюць БССР як фармальна-каланіяльнае ўтварэнне. І. Бабкоў спрабуе апісаць БССР у больш мяккіх формах: гібрыдны, змешаны посткаланіяльны феномен, з асаблівымі дачыненнямі да Расіі. БССР «найбольш адэкватна можа быць зразумета не як поўны правал нацыянальнага беларускага руху, а як посткаланіяльны кампраміс» [1, с. 161]. Беларуская савецкая дзяржаўнасць, у адрозненне ад Масквы, дзе бальшавікі перамаглі, паўстала ў выніку тактычнага кампрамісу між левым крылом нацыянальнага руху

і савецкім урадам. І перспектыва падавалася дастаткова аптымістычнай: сітуацыя давала магчымасць рэалізацыі палітычных і сацыяльных мэтаў беларускага руху практычна да 1929 года.

Сістэма беларускай савецкай ідэнтычнасці канчаткова фармуецца ў 60—70-х гадах. У гэты ж час паўстае новае грамадства, якое моцна адрознівалася ад папярэдняга. Разбураецца яго традыцыйная сацыяльная і культурная структура, якая складалася з беларускай вёскі і небеларускага (рускага, габрайскага ці польскага) горада. У позні савецкі перыяд афармляюцца беларуская савецкая культура, расійская адміністрацыя і білінгвістычны свет эмансіпаванага сялянства, якое пастунова перасяляецца ў горад. Каланіяльны тып мадэрнізацыі выклікае фармаванне рускамоўнага атачэння гарадоў. Адначасова польскасць перастае быць рэпрэзентаванаю на ўзроўні высокае культуры і перарастае ў вясковую этнаграфію[10]. Пастунова адміністрацыя становіцца ўсё больш мясцоваю (пры вялікай ролі так званае «партызанскае генерацыі»), кланаваю, але з відавочна слабым супрацьстаяннем цэнтру. Урбанізацыя робіць беларусаў большасцю гарадскога насельніцтва: «фармуецца беларуская савецкая культура як гібрыдны феномен, які базуецца на ідэях білінгвізму і бікультурнасці» [1, с. 162]. Гетэрагеннасць знайшла адлюстраванне і ў паступовым убудоўванні беларусаў у свет савецкае імперыі. Беларускі савецкі перыяд стаў мэтаю і пачаў успрымацца як паспяховае завяршэнне доўгай барацьбы беларускага народа за сваё вызваленне, што было шматкроць узмоцнена вобразам партызанскага супраціўлення падчас Другой сусветнай вайны. І гэта мела свой плён: у нефармальнай іерархіі савецкіх народаў беларусы атрымалі статус «самых лаяльных у імперыі». Структура культурнае прасторы становіцца падобнай да сучаснай: беларуская мова функцыянуе на вёсцы і ў сферы высокае культуры, руская — у адміністрацыі і грамадскім штодзённым ужытку. Першая рэпрэзентуе «этнаграфічную асаблівасць і мясцовы каларыт», другая мае характар метакультуры і захавання універсальных каштоўнасцяў.

Канец савецкага перыяду прывёў да чарговага расколу ідэнтычнасці. Паступовае згасанне памяці пра савецкую Беларусь спрычынілася да афармлення феномена, які ўмоўна можна назваць «постсавецкая ідэнтычнасць»; у апошнія гады яна хутка афармляецца ў *«новую беларускую»*[11]. Другая частка грамадства спрычынілася да аднаўлення беларускае нацыянальнае ідэнтычнасці з практыкамі вяртання праўдзівае гісторыі ды культуры. Ідэнтычнасць адначасова мела антытаталітарны (прыхільнасць да каштоўнасцяў заходняй цывілізацыі) і антыуніверсалісцкі грунт (інтэлектуальная і палітычная рэабілітацыя лакальнага).




**Мал. 1.** Траекторыя генезісу беларускае ідэнтычнасці

[10] Глядзі ў прыватнасці [4].
[11] Часам гэтая ідэнтычнасць пазначаецца як «крэольская».

## Кадыфікаваная схема генеалогіі

Вышэй выкладзены тэкст дазваляе зрабіць сінтэтычную схему генезісу беларускае ідэі. Мы не будзем канцэнтраваць увагу на дэталёвым апісанні храналогіі і перыядызацыі, але зазначым толькі адносіны паслядоўнасці і (ці) пераемнасці. Схема генезісу (мал. 1) дэманструе дастаткова разгалінаваную траекторыю развіцця (і, адпаведна, мадэрнізацыі), якая не прывяла да «нармальнае» гамагенізацыі ідэнтычнасці.

Такім чынам, Беларусь як праект паўстае з трох дастаткова аўтаномных крыніцаў, кожная з якіх спрычынілася да фармавання асобных візіяў краіны і нацыі. Праз палітычны і сацыяльны досвед «Паўночна-заходняга краю» паўстае заходнерусізм, досвед «крэсаў» афармляе тыя ці іншыя ідэі «краёвасці». «Тутэйшасць», разам з сукупнасцю этнічнае і лінгвістычнае адрознасці, сістэматызуецца ў руху беларускага «Адраджэння».

Перарыванне заходнерусізму на схеме не абазначае яго сапраўднага знікнення і адсутнасці пераемнасці. Асноўныя ўзоры заходнерускага мыслення і разумення Беларусі арганічна пераходзяць у саветызм, а затым і ў беларускую постсавецкую ідэнтычнасць. Тое ж датычыць і краёвай ідэнтычнасці: частка яе носьбітаў была інтэгравана ў польскую нацыю, частка далучылася да беларускага «Адраджэння».

Ідэнтычнасць беларускае нацыі, якая сфармавалася ва ўмовах Першае сусветнае вайны і БССР, ад пачатку не была аднароднаю. Частка насельніцтва была дастаткова глыбока інтэгравана ў сімвалічную сістэму саветызму, другая захоўвала повязь з нацыянальнай (лакальнай) традыцыяй. На стадыі БССР, аднак, гэты падзел меў латэнтны характар у рамках вобразу «беларускае сацыялістычнае нацыі» і быў рэльефна праяўлены толькі пасля распаду савецкае палітычнае і сацыяльнае сістэмы. Наяўнасць падзелу ў ідэнтычнасці сучаснае Беларусі дастаткова відавочная, і сённяшні палітычны лад не спрыяе інтэграцыі яе частак. Але калі сутнасць і арганізацыя сучаснае нацыянальнае ідэнтычнасці з'яўляецца адносна зразумелаю, дык канцэптуалізацыя таго, што тут пазначана як «постсавецкая» (з іншае перспектывы яна вызначаецца як «крэольская», «новая беларуская»[12]) выклікае пэўныя складанасці і патрабуе далейшага (у тым ліку і тэрміналагічнага) вызначэння.

**Літаратура**


1. Бабкоў І. Генэалёгія беларускай ідэі//Arche: Пачатак. — 2005. — №3. — С. 136—165.
2. Бабкоў І. М. Філасофія Яна Снядэцкага. — Мінск-Вільня, 2002.
3. Біч М., Рудовіч С. Беларуская сацыялістычная грамада//Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. — Т. 1. — Мн., 1993. С. 410—413.
4. Гернович А. Особенности этнического самосознания поляков в условиях белорусско-польского пограничья//Перекрестки. — 2005. — № 3-4. — С. 151—160.
5. Екельчык С. Нацыяналізм украінцаў, беларусаў і славакаў//Arche. — 2001. — № 2. — С. 30—41.
6. Зам А. Беларускі нацыяналізм ці нацыяналізм Беларусі?//Беларускі гістарычны агляд. — 2000. — Т. 7. — Сш. 1 (12). — Чэрвень. — С. 69—95.
7. Казакевіч А. Вялікае Княства Літоўскае як ідэалагічная рэальнасць//Arche. — 2003. — № 5. — С. 43—60.
8. Лінднэр Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX—XX стст. — СПб, 2003.
9. Радзік Р. Прычыны слабасці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX—XX стст.//Беларускі гістарычны агляд. — 1995. — Т. 2. — Сш. 2. — Снежань. — С. 195—228.
10. Радзік Р. Беларусы: Погляд з Польшчы. — Мн.: Энцыклапедыкс, 2002.
11. Смалянчук А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 — люты 1917. — СПб, 2004.
12. Терешкович П. Украинцы и белорусы: сравнительный анализ формирования нации на фоне истории Центральной и Восточной Европы XIX—XX вв.//Перекрестки. — 2004. — № 1—2. — С. 10—32.
13. Цьвікевіч А. «Западно-руссизм»: нарысы з гісторыі грамадзянскай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. — Мн., 1993.
14. Казакевіч А. Культурны фон беларускае палітыкі//Найноўшая гісторыя беларускага парламентарызму. — Мн., 2005. — С. 132—146.


[12] Гэты феномен з'яўляецца хутчэй прадуктам распаду ці натуральнае эвалюцыі постсавецкае ідэнтычнасці, чым вынікам канструктывісцкіх намаганняў існага палітычнага рэжыму, які доўгі час спрабаваў трансляваць розныя варыянты «панрусізму» і «славізму» [14].